# РЭАЛІЗАЦЫЯ ЭКЗІСТЭНЦЫЯЛЬНАЙ ПЕДАГОГІКІ Ў САЦЫЯЛЬНА-ПЕДАГАГІЧНЫМ СУПРАВАДЖЭННІ ВАЛАНЦЁРСКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў БДУКМ

**Байко А. П.**
*старшы выкладчык кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (г. Мінск)*
**Лічман А. В.**
*студэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (г. Мінск)*

***Анатацыя.*** *Аўтары артыкула звярнуліся да пытання рэалізацыі экзістэнцыяльнай педагогікі ў сацыяльна-педагагічным суправаджэнні валанцёрскай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. У выніку рэалізацыі такога подыходу фарміруецца студэнт-валанцёр, які ўмее пражыць сваё жыццё на аснове зробленага ім экзістэнцыяльнага выбару, усведамляе сэнс свайго жыцця і рэалізуе сябе ў адпаведнасці з гэтым выбарам.*

***Summary****. The authors addressed the issue of realization of existential pedagogy in the socio-pedagogical support of volunteer activities the Belarusian State University of Culture and Art. As a result of this podyhodu formed a student volunteer who knows how to live your life based on them made the existential choice, aware of the meaning of his life and realizes itself in accordance with this selection.*

За апошнія гады ва ўстанове адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» валанцёрская дзейнасць стала неад'емным элементам сістэмы выхаваўчай работы, ствараючы тым самым шырокія магчымасці для ўдзелу студэнцкай моладзі ў дадзенай дзейнасці праз валанцёрскія атрады БРСМ і студэнцкага прафсаюза, клуба СЛОН, іншых асобных праектаў. Значнасць дадзенага элемента сістэмы выхавання моладзі ўзрастае, паколькі валанцёрская дзейнасць дазваляе рэалізаваць тыя характарыстыкі асобы студэнта, якія часта застаюцца нераскрытымі ў паўсядзённым жыцці, а таксама неабходнасцю падрыхтоўкі педагагічных кадраў, якім у будучыні самім трэба будзе каардынаваць валанцёрскі рух у іншых установах адукацыі. Такім чынам, садзейнічанне студэнту ў сацыялізацыі праз уключэнне ў валанцёрскую дзейнасць, актывізуе яго ўдзел у пераўтварэнні соцыумаў. Мэтай выхаваўчай работы ў гэтым напрамку становіцца фарміраванне асобы, якая ўмее аптымальна пражываць сваё жыццё, пры гэтым максімальна выкарыстоўвае свой патэнцыял і рэалізуе сябе ў сацыяльна-значнай дзейнасці. Менавіта такая мэта з'яўляецца ідэальнай і асноўнай ідэяй экзістэнцыяльнай педагогікі, аўтарам якой выступае заслужаны дзеяч навукі РФ, доктар педагагічных навук, прафесар, дырэктар інстытута педагогікі і псіхалогіі ЯГПУ М.І. Ражкоў і яго паслядоўнікі.

З апорай на экзістэнцыяльную педагогіку, аб'ект даследавання якой мы вызначылі як суб'ектыўнае стаўленне студэнта да падзей у яго жыцці, звязаныя з валанцёрствам, а ў якасці прадмета – педагагічнае суправаджэнне гэтых падзей, якое прадугледжвае дапамогу студэнту-валанцёру ў развіцці яго асобы і індывідуальнасці.

Суправаджаць, у слоўніку Ожагава, вызначаецца як «трымацца разам, знаходзячыся побач, ведучы куды-небудзь ці ідучы за кімсьці». Тэрмін суправаджэнне азначае ў сваю чаргу «ісці побач з чалавекам, які рухаецца наперад, пераадольваючы цяжкасці». Тэрмін выкарыстоўваецца ў адносінах да чалавека, якому патрэбна дапамога, падтрымка ў пераадоленні цяжкасцяў (праблем), якія ўзнікаюць у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працэсе самарэалізацыі, дасягненні жыццёва важных мэтаў. У псіхолага-педагагічным аспекце суправаджэнне часцей за ўсё разглядаецца як метад, які забяспечвае стварэнне ўмоў для прыняцця суб'ектам развіцця аптымальных рашэнняў у розных сітуацыях жыццёвага выбару.

Сацыяльна-педагагічнае суправаджэнне навучання валанцёраў БДУКМ згодна з парадыгмай экзістэнцыяльнай педагогікі становіцца персаніфікаваным. Пры гэтым выкарыстоўваюцца бінарныя метады выхавання-самавыхавання, а пошук педагагічных сродкаў ад уніфікацыі пераходзіць да варыятыўнасці, даючы магчымасць кожнаму студэнту зрабіць свой выбар спосабаў самаадукацыі і самавыхавання. Таму і дапамогу ў гэтым выбары аказваюць вопытныя псіхолагі, сацыяльныя педагогі і кuratары. У нашым выпадку суправаджэнне – гэта заўсёды ўзаемадзеянне куратара валанцёраў (педагогаў, псіхолагаў, старэйшых студэнтаў-валанцёраў) і валанцёраў-навабранцаў па забеспячэнні своеасаблівай фасілітацыі ў адаптацыі студэнта-валанцёра да новых для яго жыццёвых сітуацый. У гэтым працэсе відавочна прысутнічае і педагагічная падтрымка як працэс сумеснага з валанцёрам вызначэння яго ўласных інтарэсаў, мэтаў, магчымасцяў і шляхоў пераадолення праблемных сітуацый у валанцёрстве. Акрамя таго, з боку псіхалагічнай службы забяспечваецца сацыяльна-педагагічнай дапамога як рэальнае садзейнічанне студэнту-валанцёру ў пераадоленні цяжкасцяў, якія ўзнікаюць: напрыклад, канфліктныя сітуацыі з іншымі валанцёрамі альбо дзецьмі, цяжкасцямі дасягнення мэты альбо выканання сваіх абавязкаў.

Усё вышэйпералічанае забяспечвае рэалізацыю асноўных прынцыпаў экзістэнцыяльнай педагогікі, якія вызначаюць патрабаванні да зместу і арганізацыі працэсу суправаджэння валанцёраў у БДУКМ:

- прынцып стымулявання самаразвіцця студэнта ў якасці асноўнага патрабавання прадугледжвае фарміраванне матываў самаадукацыі і самавыхавання (важнымі рысамі з'яўляюцца ўсвядомленасць і мэтанакіраванасць самаўдасканалення студэнта-валанцёра, яго самапазнанне і вызначэнне свайго патэнцыялу і працы над сабой, што забяспечваецца праз навучанне спосабам самапазнання, рэфлексіі, планавання жыццёвых падзей);

- прынцып пераадолення псіхалагічных бар'ераў, мабілізацыі рэсурсаў і актыўнасці ў дасягненні сваіх мэт (мэты студэнта-валанцёра істотна залежаць ад разумення ім сэнсу свайго жыцця, таму кураторы стымулююць валявыя намаганні студэнтаў для дасягнення пастаўленых мэтаў валанцёрскай дзейнасці і пазітыўны эмацыянальны стан па дасягненні гэтых мэт);

- прынцып актуалізацыі сітуацыі патрабуе аказанне дапамогі студэнту ў аналізе падзеі, вызначэнні ў ёй галоўнага і другаснага;

- прынцып сацыяльнага загартоўвання прадугледжвае ўключэнне студэнтаў у сітуацыі, якія патрабуюць валявога намагання для пераадолення негатыўнага ўздзеяння соцыуму, авалоданне пэўнымі спосабамі гэтага пераадолення, фарміравання сацыяльнага імунітэту, стрэсаўстойлівасці, рэфлексіўнай пазіцыі (рашэнне розных праблем у рэальных і сітуацыях-імітацыях, праектаванне паводзін у складаных жыццёвых сітуацыях).

Калі мы гаворым аб сацыяльна-педагагічным суправаджэнні як працэсе, то павінны разгледзець і яго асноўныя этапы (модулі). Сацыяльна-педагагічнае суправаджэнне валанцёрскай дзейнасці студэнтаў ажыццяўляецца ў рамках трох модуляў: азнаямленчага, навучальнага і дзейснага.

Азнаямленчы модуль прызначаны для інфармавання і прыцягнення студэнтаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

да валанцёрства; адбору і арыентацыі ўдзельнікаў; паглыбленага вывучэння ўласных матываў і ўстановак дзейнасці. Для інфармавання і прыцягнення валанцёраў выкарыстоўваюць розныя метады, у тым ліку: размяшчэнне інфармацыі аб дзейнасці валанцёрскіх клуба і атрада на сайце БДУКМ; аб'явы і артыкулы аб працах валанцёраў у газеце «*Alma papera*»; наглядную агітацыю (стэнды, плакаты) і распаўсюджванне брашур; публічныя выступленні пра дзейнасць валанцёрскага клуба СЛОН перад студэнцкім актывам; правядзенне рэкламных акцый і інш. Слабым пакуль застаецца на гэтым этапе планаванне работ і дакументаванне: так, у дакументацыю маглі б уваходзіць не толькі анкета валанцёра, але і кніжка валанцёра, ліст уліку валанцёрскага часу, тэксты праектаў, падзякі і водгукі аб дзейнасці валанцёраў. Лічым, што наспеў час стварыць і аформіць «Летапіс валанцёрства БДУКМ».

Навучальны этап-модуль будуецца на вышэйапісаных прынцыпах і немагчымы без трэнінгавай і рэфлексіўнай работы, і ўсіх метадаў і сродкаў сацыяльна-педагагічнага суправаджэння экзістэнцыяльнай педагогікі.

Дзейсны модуль сацыяльна-педагагічнага суправаджэння ўяўляе сабой этап практычнай дзейнасці, у працэсе якой ажыццяўляецца непасрэдная валанцёрская дзейнасць студэнтаў па розных напрамках у двух варыянтах: у першым выпадку валанцёрская дзейнасць арганізуецца і каардынуецца педагогамі ў рамках доўгатэрміновых праектаў, у другім – валанцёрская дзейнасць мае на ўвазе адзінкавыя сацыяльныя, дабрачынныя акцыі, якія не заўсёды патрабуюць прыцягнення дадатковых рэсурсаў і якія ажыццяўляюцца за больш кароткія тэрміны.

Як адзначае даследчык гісторыка-педагагічнага феномену валанцёрства Н.В. Тарасава, найважнейшымі псіхолага-педагагічнымі характарыстыкамі валанцёра з'яўляюцца ўцягнутасць, свядомасць, адказнасць [0]. І выхаванне гэтых якасцей, як і стымуляванне самаразвіцця студэнта, згодна з экзістэнцыяльнай педагогікай, павінна быць на аснове яго рэфлексіўнай ацэнкі падзей, якія адбываюцца у сітуацыях спецыяльна створаных. Пры гэтым вельмі важным з'яўляецца ўключанасць студэнтаў-валанцёраў у падзеі і актыўнае іх стаўленне да ўсяго, што падчас гэтага адбываецца. У нашай установе адукацыі навучаюцца творчыя асобы, а, як вядома, філосафы-экзістэнцыялісты асабліваю ўвагу надавалі такім фактам чалавечага быцця як каханне і творчасць. М.А. Бярдзяеў сцвярджаў, што быццё асобы немагчыма без любові (кахання) і ахвяры, без выхаду да іншага, сябра, каханага (закупораная ў сабе асоба разбураецца ...) [0]. Таму пры першым знаёмстве з валанцёрскай дзейнасцю студэнты БДУКМ разумеюць: ніхто не будзе прымушаць стаць валанцёрам, але, калі гэта будзе твой усвядомленыы выбар, то ў любы час разлічвай на таго, хто стане крочыць побач. І тады свет міласэрнасці, дабрачыннасці і валанцёрства стане часткай цябе, як і ты – часткай гэтага сусвету. Падкрэслім важнасць сацыяльна-педагагічнага суправаджэння валанцёраў у перыяд усведамлення імі падзей, якія адбываюцца ў іх жыцці, таму што падзеі становяцца не толькі фактам гісторыі, але ў адносінах да студэнта-валанцёра – фактам яго біяграфіі. Прыемна канстатаваць, што атрыманыя лісты-падзякі і рэкамендацыі арганізацый, у якіх ажыццяўлялася валанцёрская дзейнасць, падтрыманыя спецыялістамі аддзела выхаваўчай работы з моладдзю і куратарамі валанцёрскай дзейнасці БДУКМ, служаць дадаткам да партфоліа студэнтаў, спрыяюць асобасна-прафесійнаму росту і тым самым ствараюцца ўмовы для ўзнікнення і далейшага распаўсюджвання валанцёрскіх ініцыятыў.

Такім чынам, рэалізацыя на практыцы прынцыпаў экзістэнцыяльнай педагогікі ў працэсе псіхолага-педагагічнага суправаджэння студэнтаў-валанцёраў напаўняе іх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жыццё новым сэнсам, фарміруе студэнта-валанцёра, які ўмее пражыць сваё жыццё на аснове зробленага ім экзістэнцыяльнага выбару, усведамляе сэнс свайго жыцця і рэалізуе сябе ў адпаведнасці з гэтым выбарам.


1. Бердяев, Н.А. О назначении человека. / Н. А. Бердяев. – М. : Республика, 1993. – С. 64.

2. Казимирская, И. И. Педагогическая культура мира как пространство профессионального и личностного развития будущего учителя / И. И. Казимирская // Педагогическая культура мира [Электронный ресурс]. – Режим доступа : elib.bspu.by/bitstream. – Дата доступа : 27.08.2016.

3. Рожков, М. И. Концепция экзистенциональной педагогики / М. И. Рожков // Ярославский педагогический вестник. – 2002. – № 4 (33) [Электронный ресурс]. – Режим доступа : vestnik.yspu.org/releases/pedagoka_i_psichologiy/18_1. – Дата доступа : 17.08.2016.

4. Рожков, М. И. Педагогическое обеспечение работы с молодежью. Юногогика : учеб. пособие для студентов вузов, обучающихся по специальности / М. И. Рожков. – М. : Гуманитар. изд. центр ВЛАДОС, 2008. – 264 с.

5. Тарасова, Н. В. Волонтерская деятельность как историко-педагогический феномен / Н. В. Тарасова // Педагогическое образование в России. – 2012. – № 4. – С. 46–52.


## ПЕДАГОГИЧЕСКИЙ ПОТЕНЦИАЛ СОЦИАЛЬНО-КУЛЬТУРНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ В ПРОЦЕССЕ ПРОФЕССИОНАЛЬНОГО САМООПРЕДЕЛЕНИЯ СТУДЕНЧЕСКОЙ МОЛОДЕЖИ


**Батура А. Ю.**

*магистр педагогики, аспирант кафедры педагогики социокультурной деятельности Белорусского государственного университета культуры и искусств (г. Минск)*



***Аннотация**. В статье раскрывается значимость социально-культурной деятельности на каждом этапе процесса профессионального самоопределения студенческой молодежи: при определении прирожденных талантов, выявлении профессиональной миссии и принятии решения о профессиональной деятельности. В сравнительной схеме подходов к профессиональному самоопределению раскрыта значимость подхода на основе выявления прирожденных талантов.*

***Summary**. The article reveals the importance of socio-cultural activities at every stage of the process of students professional self-determination: the determination of natural talent, identifying professional mission and making a decision on professional activity. The comparative scheme approaches to professional self-determination revealed the importance of an approach based on identifying natural talents.*


Переход от постиндустриального к информационному обществу оказал существенное влияние на поведение молодых людей на рынке труда и образовательных услуг. В связи с резко возросшим доступом к информации и увеличением вариативности выбора жизненного пути, возникла проблема в том, что молодые люди не знают по какой траектории выстроить свой профессиональный путь. Молодежь талантлива, но не мотивирована.

Можно говорить о вторичном профессиональном самоопределении, так как в рамках первичного профессионального самоопределения молодые люди сменили статус выпускника школы на статус студента конкретного учебного заведения. Как



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ